## Венская дэкларацыя аб прыродаахоўных стандартах для медыцынскіх устаноў.

*Мы, удзельнікі першага Інтэрнацыянальнага Кангрэса па ахове здароўʼя па скарыстанню ўстойлівых вырабаў і практык "CleanMed Europe", сабраліся ў Вене з 6 па 8 кастрычніка 2004 і дэкларавалі нашыя погляды ў мэтах рэалізацыі наступных прынцыпаў:*

Бесперапынна ўзрастаючая ступень забруджвання і выніковая шкода для прыродных экасыстэм сурʼёзна пагражаюць здароўʼю людзей па ўсім свеце. Дзейнасць медыцынскіх устаноў прыўносіць свой уклад у наступствы для навакольнага ассяроддзя і здароўʼя. Грамадства чакае ад супрацоўнікаў сферы аховы здароўʼя не толькі працы па лячэнні пацыентаў, але ж і працы па прадухіленні щзникнення захворванняў падчас падтрымкі здароўʼя. Мы востра ўсведамляем неабходнасць перабудовы сферы аховы здароўʼя такім чынам, каб *гэтая сфера была экалагічна ўстойліва* і не зʼяўлялася больш крыніцай шкоды для грамадскага здароўʼя і навакольнага асяроддзя.

*Ахова навакольнага асяроддзя павінна быць асноўным прынцыпам, якім бы кіраваліся ў сваёй дзейнасці медыцынскія установы.* Прыродаахоўныя меркаванні павінны зʼяўляцца асноўным кіруючым прынцыпам і быць улічанымі пры прыняцці ўсіх вырашэнняў, пры здзяйсненні працэдур і практык без шкоды для якасці паслуг у сферы аховы здароўʼя. Гэта забяспечвае медыцынскіх працаўнікоў магчымасцю падтрымліваць неабходныя экалагічныя змены ў грамадстве і паказваць добрыя прыклады больш устойлівага ладу жыцця.

Мы ўсведамляем нашу адказнасць перад людзьмі, якія працуюць у медыцынскіх установах і разглядаюць *прадухіленне забруджвання як асноўны ўдзел у ахове здароўʼя і дабрабыту супрацоўнікаў, пацыентаў і наведвальнікаў.*

Абавязковыя экалагічныя стандарты павінны быць усталяваны для медыцынскіх устаноў ва ўсіх істотных пытаннях і сферах, якія ўключаюць:

- Прымяненне строгіх прыродаахоўных крытэрыяў пры абранні пастаўшчыкоў і вырабаў (зялёнае набыццё).
- Дзе магчыма без шкоды для якасці і бяспекі паслуг у сферы аховы здароўʼя, замяніць вырабы з ненатуральных кампанентаў, такіх як ПВХ (полівініл хларыд), устойлівых таксічных хімічных рэчываў ці цяжкіх металаў на вырабы, якія адпавядаюць цыклу прыродных матэрыялаў (могуць лёгка распадацца ў прыродзе).
- Выкарыстоўванне ежы, якая была арганічна вырашчана і сумленна прададзена, сама меней на 30 % ад усяго спажывання ежы.
- Выкарыстоўванне энергіі, якая была генерыравана з аднаўляльных крыніц.
- Скарачэнне спажыўлення і імкненне да эффектыўнага карыстання ўсімі рэсурсамі: матэрыяламі, энергіяй, вадой.
- Заўжды ўлічваць магчымасць замены аднаразовых вырабаў і прымяняць рэстэрылізацыю медыцынскіх вырабаў.
- Пабудова і аднаўленне медыцынскіх ўстаноў вольнымі ад таксічных рэчываў, з нізкім энергаспажываннем, якія будуць прытрымлівацца прынцыпаў зяленага дызайну і дабрачынных прынцыпаў.
- Захаванне зяленых зон медыцынскіх устаноў і пераўтварэнне іх у зоны, якія будуць карыснымі для здароўʼя. Трэба звяртаць увагу людзей, наколькі гэтыя зоны прыгожы.

- Інфарміраванне супрацоўнікаў, пацыентаў і грамадскасці аб усіх істотных экалагічных аспектах дзейнасці вашай медыцынскай установы.
- Распрацаваць усеабдымную прыродаахоўную стратэгію, усталяваць прыродаахоўныя праграммы з мэтамі і мерамі вымярэння, пабудаваць прыродаахоўную арганізацыю і карыстацца сістэмай экалагічнага мэнэджмента пры здзяйсненнні працы.

Ахова навакольнага асяроддзя і ахова здароў'я ў аднолькавай ступені з'яўляюцца асноўнымі мэтамі нацыянальнай і інтэрнацыянальнай стратэгіі. Трэба ўлічваць тое, што Еўрапейскі Саюз і нацыяналныя ўрады павінны ўсталяваць і пашыраць неабходную заканадаўчую базу для яднання прыродаахоўных стандартаў у грамадстве і для медыцынскіх устаноў.